УДК 947:6

# ДЗЕЙНАСЦЬ ГАЛОЎНАЙ ВІЛЕНСКАЙ ДУХОЎНАЙ СЕМІНАРЫІ З 1830 ПА 1833 гг.

**Масейчук Людміла Іванаўна,**
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле апісваюцца падзеі, звязаныя з дзейнасцю Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі ў перыяд з 1830 па 1833 гг. Разглядаюцца прычыны яе рэарганізацыі ў Рымска-каталіцкую духоўную акадэмію.*

Галоўная Віленская духоўная семінарыя, адкрытая пры Віленскім універсітэце, пачала сваю працу ў 1808/1809 навучальным годзе. Бюджэт семінарыі ў 15 000 руб. срэбрам дазваляў даваць бясплатную адукацыю 50 клірыкам рымска-каталіцкай царквы абодвух абрадаў. Яе выхаванцы набылі выключнае права займаць вышэйшыя пасады ва ўніяцкай і каталіцкай цэрквах Расійскай імперыі.

З-за масавага ўдзелу студэнтаў Віленскага універсітэта ў паўстанні 1830–1831 гг., міністр народнай асветы, К. А. Лівена (1828–1833) у маі 1831 г спыніў афіцыйную перапіску з універсітэтам. Нягледзячы на тое што клірыкі Галоўнай семінарыі не прымалі актыўнага ўдзелу ў паўстанні, рэпрэсіўныя меры закранулі і яе.

21 снежня 1831 г. (2 студзеня 1832 г.) апошні рэктар Імператарскага Віленскага ўніверсітэта В. В. Пелікан (1826–1832), па заданні міністра народнай асветы князя К. А. Лівена, падрыхтаваў адпаведную інфармацыю «о благонадежности учительского и обслуживающего персонала Виленского университета» [1, s. 199]. Сярод 159 выкладчыкаў, характарыстыку на якіх даў рэктар, былі і прозвішчы настаўнікаў, Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі.

Негатыўны водгук атрымалі рэгенс семінарыі Ян Маркевіч (1829–1833) [2, s. 108], а таксама прафесары Антоній Фіялкоўскі і Міхаіл Баброўскі. Апошні, на думку рэктара, «хоть долго старался спрятать предательский способ мышления, но все его действия, поступки и контакты характеризуют его как человека злого, неблагодарного не исправившегося после отбытого наказания и помилования» [1, s. 201]. Да асоб «правомыслящих, «благонадежных и заслуживающих доверия правительства» В. В. Пелікан адносіў капелана семінарыі, прафесара філасофіі і логікі Віленскага ўніверсітэта ксяндза Анёла Даўгірда, а таксама прафесараў Яна Скідэля і Алаізія Капэлі [1, s. 201].

Неабходна адзначыць, што справаздача рэктара не мела істотных негатыўных наступстваў для Галоўнай семінарыі. Усе выкладчыкі, у тым ліку і «недобронадежные», засталіся на сваіх месцах. Гэта тлумачылася тым, што з-за недахопу прафесарска-выкладчыцкага складу звальненне вышэйназваных навукоўцаў прывяло б да зрыву ўсяго адукацыйнага працэсу семінарыі. Пра гэта паведаміў на чарговым семінарскім Савеце яе рэгенс Ян Маркевіч [2, s. 108].

Загадам імператара Мікалая І (1825–1855) ад 1 (13) мая 1832 г. Віленскі ўніверсітэт быў зачынены. Галоўная Віленская духоўная семінарыя павінна была быць рэарганізавана ў Рымска-каталіцкую духоўную акадэмію. Выкладчыкам семінарыі было загадана аказваць «всяческую помощь» пры арганізацыі вышэйназванай навучальнай установы [3]. Стварэннем Духоўнай акадэміі было даручана заняцца прафесару Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі Бенедык-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ту-Анджэю Клангевічу. Міністр унутраных спраў граф Д. М. Блудаў (1832–1838), у лісце ад 7 (19) кастрычніка 1832 г. прасіў яго «заниматься данным заведением до момента его преобразования» і «желал получать подробную информацию» пра стан спраў у Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі [1, s. 208].

Нягледзячы на ўсе намаганні Бенедыкта Клангевіча, да новага 1832/1833 навучальнага года пераўтварыць Галоўную семінарыю ў Духоўную акадэмію не атрымалася.

19 верасня (1 кастрычніка) 1832 г. у Галоўнай семінарыі пачаўся апошні навучальны год. Да працы, разам з прафесарамі тэалогіі і выкладчыкамі моў, прыступілі два адстаўныя прафесары закрытага Віленскага ўніверсітэта: прафесар Ян Станіслаў Костка-Грыневіч, які выкладаў класічную філалогію, і прафесар Леон Бароўскі – выкладчык польскай літаратуры і гамілетыкі.

З 27 кастрычніка (8 лістапада) 1832 г. у Галоўнай семінарыі пачала працу спецыяльная камісія, у задачу якой уваходзіла вывучэнне фінансавага стану ўсіх духоўных фундушаў, што належалі навучальнай установе. Па выніках рэвізіі камісія павінна была прыняць рашэнне, якія менавіта духоўныя бенефіцыі будуць аддадзены на ўтрыманне Рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі. Да гэтай камісіі регенс павінен быў звяртацца па ўсіх пытаннях, звязаных з вучэбнай, паўсядзённай і эканамічнай дзейнасцю семінарыі, якія раней знаходзіліся ў кампетэнцыі семінарскага Савета. Такім чынам, семінарскі Савет страціў свае юрыдычныя паўнамоцтвы і фактычна выконваў ролю дарадчага органа.

Тым не менш навучальны 1832/1833 год праходзіў даволі паспяхова. Паміж духоўнымі асобамі і адміністрацыяй навучальнай установы канфліктных сітуацый не ўзнікала, не гледзячы на адчувальную адміністрацыйную перабудову навучальнай установы.

З перапіскі регенса Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі Яна Маркевіча і дыяцэзіяльных біскупаў відаць, што ў паўсядзённым жыцці клірыкаў мала што змянілася. Галоўная семінарыя падтрымлівала статус закрытай духоўнай установы, у якой распарадак дня, форма пакаранняў і заахвочванняў засталіся непарушнымі. За духоўнымі асобамі вялося строгае назіранне і, па магчымасці, ствараліся ўсе ўмовы для заняткаў навукамі.

З 1830 да 1832 гг. з 20 алюмнаў рымска-каталіцкага веравызнання, якія паступілі ў семінарыю, за дрэнную паспяховасць быў выключаны толькі адзін семінарыст – Іван Галавацкі (навучаўся ў семінарыі з 1(13).08.1830 г. па 15(27).06.1831 г. [4, арк. 1зв.–2]. Рафаіл Ужумедскі (23.08.1829 – 07.01.1831) быў выключаны па хваробе [1, s. 263]. Яшчэ пра двух семінарыстаў звестак не захавалася. З пакінутых 16 клірыкаў двое скончылі курс навук у Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі, а 14 – перайшлі ў Духоўную акадэмію [5, s. 639].

1 (13) ліпеня 1833 г. выйшаў указ аб адкрыцці на базе Галоўнай Віленскай духоўнай семінарыі Рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі [6, т. 8, ч. 1, с. 386–395]. Галоўная Віленская духоўная семінарыя завяршыла сваё 25-гадовае існаванне. За гэты час вышэйшую тэалагічную адукацыю ў ёй атрымалі 158 прадстаўнікоў рымска-каталіцкай царквы і 53 – грэка-каталіцкай.

## Літаратура

1. Worotyński, W. Seminarium Główne w Wilnie : drugi okres dziejów i zniesienie (1816–1833) / W. Worotyński. – Wilno : Zorza, 1938. – XVII, 307 s.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Biełiński, J. Uniwersytet Wileński (1579–1831) : w 3 t. / J. Biełiński. – Kraków : W. L. Anczyc, 1899–1900. – T. 2. – [8], 485, [2] s.

3. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1341. Оп. 34. Д. 3735. Об учреждении духовной католической академии в г. Вильне. 1833 г.

4. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 733. Оп. 62. Д. 1038. Донесение совета Виленского университета о выпуске воспитанников Главной семинарии и присвоении им ученых степеней. 25 июля 1830 г.

5. Мосейчук, Л. И. Главная Виленская духовная семинария (1808–1832 года): основные направления деятельности и личный состав учащихся / Л. И. Мосейчук // Między Rzymem a Nowosybirskiem. Księga Jubileuszowa dedykowana Ks. Marianowi Radwanowi SCJ / Katolicki Uniw. Lubelski Jana Pawła II ; red.: I. Wodzianowska, H. Łaszkiewicz. – Lublin, 2012. – S. 635–653.

6. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2 : с 12 дек. 1825 по 28 февр. 1881. : в 55 т. – СПб. : Тип. II отд-ния собств. Е. и. вел. канцелярии, 1830–1884. – 55 т.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова